**НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ**

Пастаянная камісія па нацыянальнай бяспецы

Дом Урада, 220010, г. Мінск
тэл./факс (017) 222 63 35, факс (017) 327 37 84
E-mail: nacby@house.gov.by

**НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ**

Постоянная комиссия по национальной безопасности

Дом Правительства, 220010, г. Минск
тел./факс (017) 222 63 35, факс (017) 327 37 84
E-mail: nacby@house.gov.by

23.12.2024 № 05-05/374

[redacted]

Ваш калектыўны электронны зварот аб увядзенні крымінальнай адказнасці за адмаўленне так званых сталінскіх рэпрэсій разгледжаны Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай бяспецы сумесна з іншымі пастаяннымі камісіямі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Інфармацыя, якая змяшчаецца ў вашым звароце, прынята да ўвагі.

Праблема разумення сталінскіх рэпрэсій, як адзначана вамі, патрабуе навуковага аналізу і культурнага ўсведамлення, у тым ліку ў плане суадносін асабістых, грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 130-З «Аб нарматыўных прававых актах» заканатворчая дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на планавай аснове.

Планы падрыхтоўкі законапраектаў распрацоўвае Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей — НЦЗПІ), які з'яўляецца навукова-практычнай дзяржаўнай установай і забяспечвае падрыхтоўку праектаў заканадаўчых актаў у Рэспубліцы Беларусь, правядзенне навуковых даследаванняў у галіне права. Адной з ключавых функцый НЦЗПІ з'яўляецца збор і абагульненне прапаноў па пытаннях удасканалення заканадаўства.

Згодна з артыкулам 38 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах» пры распрацоўцы планаў падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў разглядаюцца ў тым ліку і прапановы грамадзян.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае, вы маеце права накіраваць прапанову аб падрыхтоўцы заканадаўчага акта, які прадугледжвае карэкціроўку Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, у НЦЗПІ.

У выпадку нязгоды з адказам на зварот заяўнік мае права абскардзіць яго ў парадку, устаноўленым артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».

Старшыня
Пастаяннай камісіі Г.У.Лепяшко

И.А. Марзалюк